Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

# П А Ш П А Р Т
## гісторыка-культурнай каштоўнасці

**Забудова вул. Камсамольскай**
**Будынак**
**г. Віцебск, вул. Камсамольская, 28**

(назва і адрас)

В.а. дырэктара
Праектнага філіяла ААТ «Белрэстаўрацыя» ______ І.Б.Кандратаў

(пасада кіраўніка і назва арганізацый, якой падрыхтаваны пашпарт) (подпіс) (уласнае імя, імя па бацьку, (калі такое маецца), прозвішча)

ПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО ПРОЕКТНЫЙ ФИЛИАЛ БЕЛРЕСТАВРАЦИЯ г. МИНСК

| | |
|---|---|
| 1. Назва *Забудова вул. Камсамольскай*<br>(згодна з Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь) | 2. Шыфр *213Г000034*<br>(згодна з Дзяржаўным спісам гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь) |
| 3. Катэгорыя (0/1/2/3/без катэгорыі; А/Б): *3* | |
| Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад *14* *мая* *2007* г. № *578* | |
| Назва *Будынак (у складзе забудовы вул. Камсамольскай)* | |
| Катэгорыя (0/1/2/3/без катэгорыі; А/Б): *без катэгорыі* | |

| 4. Від | *матэрыяльная* |
|---|---|

(матэрыяльная або нематэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць)

5. Тып:

| А. (матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць) | *нерухомая гісторыка-культурная каштоўнасць: помнік архітэктуры* |
|---|---|

(рухомая або нерухомая: дакументальны помнік, запаветныя мясціны, помнік археалогіі, помнік архітэктуры, помнік гісторыі, помнік горадабудаўніцтва, помнік мастацтва)

| Б. (нематэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць) | |
|---|---|

(звычаі, традыцыі, абрады, фальклор, мова, яе дыялекты, змест геральдычных, тапанімічных аб'ектаў і твораў народнага мастацтва, іншыя праяўленні творчасці чалавека)

| | | | |
|---|---|---|---|
| 6. Стыль (матэрыяльная гісторыка-культурная каштоўнасць) | *мадэрн* | | |
| 7. Месцазнаходжанне гісторыка-культурнай каштоўнасці (па сучаснаму адміністрацыйна-тэрытарыяльнаму падзелу) | *Віцебская* | | *г. Віцебск* |
| | (вобласць) | (раён) | (населены пункт) |
| | *вул.Камсамольская,28* | | |
| | (плошча / вуліца / завулак і нумар будынка) | | |

| | | | |
|---|---|---|---|
| 8. Гістарычны адрас (на момант узнікнення гісторыка-культурнай каштоўнасці і наступныя змены адрасу) | *Віцебская губерня РСФСР*<br><br>*Віцебская акруга* | *Віцебскі павет*<br><br>*Заходняя вобласць*<br>*Віцебскі раён* | *г. Віцебск*<br><br>*г. Віцебск*<br><br>*г. Віцебск* |
| | (губерня) | (павет) | (населены пункт) |
| | *вул. Ніжняя Пятроўская* | | |
| | (плошча / вуліца / завулак і нумар будынка) | | |

9. Гісторыя фармавання гісторыка-культурнай каштоўнасці:

| Узнікненне; віды работ | Дата | Стваральнік або аўтар |
|---|---|---|
| *Будаўніцтва* | *пачатак XX ст.* | *не вядомы* |
| *Рамонт* | *1948 г.* | |
| | | |

| | | |
|---|---|---|
| 10. Выкарыстанне | *жылы дом* | *будынак нежылы, ідэнтыфікаваны як помнік архітэктуры* |
| | (гістарычнае) | (сучаснае) |

| 11. Уласнік (уладальнік) або носьбіт | Лакалізацыя валодання | Форма ўласнасці | Дата наступлення/ заканчэння правоў уласнасці | Ахоўнае абавязацельства (дата і нумар рэгістрацыі) |
|---|---|---|---|---|
| *ДУ «ЖРЭТ Чыгуначнага раёна»* | | *дзяржаўная камунальная* | *1983 г.* | *25.01.1994 г. № 93 21.09.2011 г. №11-02-07/2470* |
| *Даччынае камунальнае ўнітарнае жыллёвае рамонтна-эксплуатацыйнае прадпрыемства «ЖРЭТ Кастрычніцкага раёна"* | *увесь будынак інв. № 200/С-1795* | *дзяржаўная камунальная* | *10.04.2015 г.* | |

12. Тэхнічная характарыстыка (для матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці):

| | |
|---|---|
| 1. Сучасны тэхнічны стан | *не зусім здавальняючы* |
| | (здавальняючы / нездавальняючы / аварыйны) |

| 2. Асноўныя будаўнічыя матэрыялы | 3. Плошча забудовы, м$^2$ | 4. Будаўнічы аб'ём, м$^3$ | 5. Агульная плошча, м$^2$ |
|---|---|---|---|
| *цэгла* | *401* | *4966* | *853,8* |
| | 6. Вышыня, м | 7. Даўжыня, м | 8. Шырыня, м |
| | — | — | — |

13. Апісанне гісторыка-культурнай каштоўнасці.

*Трохпавярховы прамавугольны ў плане будынак накрыты двухсхільным дахам. Галоўны фасад патынкаваны і пафарбаваны. Мае сіметрычную кампазіцыю. Вылучаны цэнтральным (на шырыню аднаго аконнага праёма) і двума бакавымі (на шырыню двух аконных праёмаў) несапраўднымі рызалітамі. На ўзроўні 2-га і 3-га паверхаў фасадная плоскасць несапраўдных рызалітаў фланкіравана руставанымі лапаткамі. Па гарызанталі фасад падзелены цягай пад вокнамі першага паверха і паміж першым і другім паверхамі. У цэнтры фасада знаходзіцца дзвярны праём увахода, фланкіраваны пілястрамі і трохчвэртнымі калонамі. Над уваходам размешчаны высокія вокны лесвічнай клеткі. Паміж цэнтральным і бакавымі рызалітамі на другім паверсе маюцца эркеры са скругленымі вугламі, завершаныя балконамі 3-га паверха. Фасад члянёны прамавугольнымі аконнымі праёмамі без ліштваў, знізу вокны падкрэслены карнізнымі паяскамі. Узбагачаюць фасад ляпныя элементы: пад вокнамі трэцяга паверха дэкаратыўныя кранштэйны, упрыгожаныя лістамі аканта, вянкі, гірлянды. Завершаны фасад фрызам з трыгліфамі і карнізам з мадульёнамі.*

*Тарцовы паўднёвы фасад патынкаваны, фланкіраваны руставанымі лапаткамі на вышыню другога і трэцяга паверхаў, падзелены міжпаверхавай цягай, члянёны нішамі-блендамі, на трэцім паверсе акцэнтаванымі карнізнымі паяскамі на дэкаратыўных ляпных кранштэйнах. Завершаны фасад карнізам. Трохвугольны франтон, утвораны схіламі даху, прарэзаны двума аконнымі праёмамі без дэкору. Бакавы паўночны фасад нетынкаваны глухі, выключэнне складаюць дзве люкарны на трохвугольным франтоне. Да фасада прымыкае аднапавярховы невялікі цагляны будынак.*

*Дваровы фасад нетынкаваны, прарэзаны прамавугольнымі аконнымі праёмамі, афармленымі клінчатымі перамычкамі. Завершаны карнізам.*

*Захаваліся аконныя пераплёты, каваныя агароджы лесвіцы.*

14. Элементы, якія маюць свае адметныя духоўныя, мастацкія і (або) дакументальныя вартасці:

| Шыфр | Назва | Дата | Катэгорыя |
|---|---|---|---|
| | *адсутнічаюць* | | |

**15. Гістарычная даведка** (гісторыя ўзнікнення, асноўныя этапы фармавання і развіцця, падзеі і асобы, звязаныя з помнікам, гісторыя даследаванняў помніка).

*Будынак размешчаны ў гістарычным цэнтры г. Віцебска, у складзе комплекснай гісторыка-культурнай каштоўнасці – забудовы вул. Камсамольскай (да 1927 г. вул. Ніжняя Пятроўская).*

*Мураваная забудова вул. Камсамольскай, якая часткова захавалася да нашага часу, была сфарміравана ў другой палове 19 – пачатку 20 ст. Трэба адзначыць, што сярод гістарычнай забудовы вуліцы будынак № 28 вылучаецца сваім арыгінальным архітэктурным рашэннем.*

*Дакладная дата будаўніцтва жылога дома ў фондах Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі не выяўлена. У тэхнічным пашпарце як год будаўніцтва памылкова пазначаны 1948 г. Несумненна, у той час жылы дом быў адрамантаваны і ўведзены ў эксплуатацыю пасля Вялікай Айчыннай вайны. Па стылістычных асаблівасцях*

*будынак адносіцца да пачатку 20 ст. і, хутчэй за ўсё, будаваўся як даходны дом, дзе кватэры здаваліся ў наём. У гэты перыяд шырокае распаўсюджанне ў архітэктуры Беларусі атрымаў стыль мадэрн. Як адзначыў Ю.А.Якімовіч, у Віцебску мадэрна ў чыстым выглядзе не было. Гэта выказванне даследчыка пацвярджаецца і на прыкладзе будынка № 28, дзе мадэрн мастацкі спалучаецца з неакласіцыстычным стылем. Галоўны фасад дома вырашаны строга сіметрычна. Выразна выяўляецца яго вертыкальнае чляненне несапраўднымі рызалітамі, акцэнтаванымі буйна руставанымі лапаткамі, двума эркерамі з балконамі. Фасад упрыгожаны адмысловым ляпным дэкорам.*

*У час акупацыі Віцебска нямецкімі войскамі будынак не атрымаў значных пашкоджанняў. Слядоў істотных перабудоў на фасадах не выяўлена, трэба адзначыць, што захаваліся аўтэнтычныя аконныя пераплёты і ўнутры лесвіцы з кованымі агароджамі.*

*Будынак з'яўляецца яскравым прыкладам грамадзянскай забудовы Віцебска пачатку 20 ст.*

16. Асноўная бібліяграфія.

*Кулагін, А.М. Эклектыка. Архітэктура Беларусі другой паловы XIX – пачатку XX ст. /А.М.Кулагін – Мінск: Ураджай, 2000. – С. 238 – 245.*

*Якімовіч, Ю.А. Помнікі мураванага грамадзянскага дойлідства Віцебска XIX – пачатку XX ст. / Ю.А.Якімовіч. — Мінск: Полымя, 1990. — С. 9-10.*

17. Архіўныя крыніцы.

18. Навуковы кіраўнік:

| Прозвішча, імя, імя па бацьку (калі такое маецца) | Дата і нумар прызначэння | Нумар пасведчання | Арганізацыя, дзе працуе, яе адрас і тэлефон |
|---|---|---|---|
| *Роцька Ігар Міхайлавіч* | *12.10.1995 г.*<br>*№ 108* | — | *ТАА «Будгандльсэрвіс»*<br>*г. Віцебск, вул. Імя газеты «Праўда», 26Б*<br>*тэл.+375 29 7115131* |

19. Наяўнасць навукова-праектнай дакументацыі (для матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей):

| Праектная арганізацыя | Назва і стадыя праектных работ | Год распрацоўкі | Нумар і дата заключэння Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь |
|---|---|---|---|
| *УП «Віцебскжылпраект»* | *Мадэрнізацыя жылога дома з рэстаўрацыяй фасадаў па вул. Камсамольскай, 28 у г. Віцебску. Будаўнічы праект* | *2005 г.* | |

20. Праект зон аховы (для нерухомай матэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці):

| Праектная арганізацыя | Назва | Год распрацоўкі | Зацверджаны (дата і нумар пастановы Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь) |
|---|---|---|---|
| *НПРУП «БелНДІПГорадабудаўніцтва»* | *Дэталёвы план цэнтра г. Віцебска з праектам рэгенерацыі гістарычнай зоны* | *2005 г.* | |

21. Звесткі аб фіксацыі нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці (графічнымі і тэхнічнымі сродкамі).

22. Ілюстрацыйныя матэрыялы.











23. Дадатковыя звесткі аб падзеях і асобах, звязанных з гісторыка-культурнай каштоўнасцю.

30.06.2015 Складальнік: Праектны філіял ААТ «Белрэстаўрацыя»

(дата складання пашпарта) (назва юрыдычнай асобы)

галоўны спецыяліст Чарняўская Л.Л.

(пасада, прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца))